Супрановіч, А. Узнагароды атрымалі ўдзельнікі афганскай вайны / А. Супрановіч // Дняпроўская праўда. — 2009. — 18 лют. — С. 2.

УЗНАГАРОДЫ АТРЫМАЛІ ЎДЗЕЛЬНІКІ АФГАНСКАЙ ВАЙНЫ

Дваццаць гадоў таму завяршылася ваенная аперацыя з удзелам абмежаванага кантынгенту Савецкіх войскаў у Афганістане. Ва ўмовах смяротнай небяспекі сыны нашай Радзімы мужна і стойка выконвалі баявыя задачы, імкнучыся прынесці на афганскую зямлю мір і спакой. Некаторых з іх вы бачыце на гэтых здымках.

Сёння ўдзельнікі баявых дзеянняў у гарачых кропках актыўна працуюць, выхоўваюць дзяцей і ўнукаў, вядуць патрыятычную работу.

У мінулую пятніцу на сцэне раённага Дома культуры горада Дуброўна адбылося святочнае мерапрыемства з нагоды 20-годдзя з дня выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

Акрамя сустрэчы з баявымі сябрамі па афганскай вайне гэтых немаладых ужо людзей чакаў невялічкі канцэрт у іх гонар і ўзнагароджанне медалямі. Усім былым ваеннаслужачым, прайшоўшым афганскую вайну, ваенны камісар Дубровенскага раёна Ігар Іванавіч Літоўчык уручыў юбілейную ўзнагароду і павіншаваў з памятнай датай. Таксама некалькі ўзнагарод уручыў начальнік Дубровенскага РАУС Анатоль Дзмітрыевіч Купко супрацоўнікам райаддзела ўнутраных спраў за доблесную службу ў Афганістане.

Антон Супрановіч

На здымку: былы воін-афганец, а цяпер вадзіцель аўтобуса прадпрыемства меліярацыйных сістэм Міхаіл Міхайлавіч Капелька з юбілейным медалём